# ПАМЯЦЬ



23 красавіка на 83-м годзе жыцця памёр вядомы фалькларыст, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Анатоль Серафімавіч Емяльянаў. Для многіх пакаленняў выпускнікоў нашага ўніверсітэта, найперш педагагічнага факультэта і факультэта беларускай філалогіі і культуры, ён быў прыкладам высакароднага выкладчыка з вялікім сэрцам, тонкім пачуццём гумару, унікальнымі, энцыклапедычнымі ведамі. Анатоль Серафімавіч заўсёды шчыра сябраваў і падтрымліваў цёплыя адносіны са сваімі былымі студэнтамі.

Нарадзіўся А.С. Емяльянаў у вёсцы Боркі Панізаўскага раёна Смаленскай вобласці ў сям'і служачых. Скончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Працаваў настаўнікам рускай і беларускай мовы і літаратуры ў Пальмінскай сярэдняй школе Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці, намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце. З 1966 года пачаў выкладаць у Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя С.М. Кірава. Скончыў аспірантуру пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У 1985 годзе яму была прысуджана вучоная ступень кандыдата філалагічных навук.

З 1983 па 1996 год Анатоль Серафімавіч узначальваў кафедру рускай і беларускай мовы на факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання, пасля працаваў дацэнтам кафедры ўсходнеславянскай філалогіі і лінгвадыдактыкі, дацэнтам кафедры беларускай літаратуры.

Вучоны з'яўляўся аўтарам звыш 80 навуковых работ, суаўтарам фундаментальных прац Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі па пытаннях развіцця беларускай народнай лірыкі.

Анатоль Серафімавіч сябраваў з многімі вядомымі беларускімі пісьменнікамі, мастакамі, культурнымі дзеячамі. Аднакласнікам і блізкім сябрам яго быў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін.

У памяці калег, студэнтаў ды ўсіх, хто ведаў А.С. Емяльянава, ён назаўсёды застанецца светлым, спагадлівым, інтэлігентным чалавекам, выдатным вучоным, Педагогам з вялікай літары.

Выказваем спачуванне родным і блізкім Анатоля Серафімавіча.

**Калектыў кафедры літаратуры.**